***В. У. Міронава*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***А. М. Мельнікава****,*
*к.ф.н., дацэнт*

## ПОШУКІ ВІКТАРА ЖЫБУЛЯ Ў ГАЛІНЕ ФОРМЫ

На пачатку творчасці В. Жыбуль шмат увагі надаваў форме сваіх вершаў. Выбітнай старонкай яго творчай біяграфіі можна назваць паліндромныя вершы. В. Жыбуль – аўтар не толькі паліндромных вершаў, але і першых у беларускай паэзіі паэм-паліндромаў і нават паліндромнага апавядання пад назвай «Хам у думах». У паэмах такога кшталту, нягледзячы на немагчымасць уцямнай перадачы зместу, выразна прасочваюцца пафас, агульная ідэя. Гэта сведчыць пра надзвычайную чуйнасць аўтара да сродкаў мовы, іх магчымасцей.

Назіраецца ў ранняй творчасці і захапленне візуальнай паэзіяй, напрыклад, верш «Трансфіліпуцыя». Гэты твор мы потым сустрэнем у зборніку «Дыяфрагма», а таксама іншыя вершы-фігуры («Горны тэхнапейзаж», «Плюмбікон», «Літры літар», «Я і час»). Уся візуальная паэзія В. Жыбуля – дадатковае фармальнае выражэнне зместу твораў, якое пашырае і паглыбляе прастору іх успрымання.

Актыўна выкарыстоўваюцца ў ранняй творчасці і вершах зборніка «Дыяфрагма» алітэрацыя і адсутнасць знакаў прыпынку. Адсутнасць знакаў прыпынку не толькі адсылае нас да літаратуры «плыні свядомасці» (як, напрыклад, вершы-медытацыі: «Медытацыя ўяўлення», «Медытацыя вольнасці», «Медытацыя імкнення»). Гэта і своеасаблівы пасыл аўтара на непатрэбнасць знакаў прыпынку ў дадзеным канкрэтным творы: чытач успрымае ў якасці адзінак тэксту фразы, якія аўтар падае асобнымі радкамі. Яны самім сваім сэнсам уздзейнічаюць на рэцыпіента. Аднак у зборніку набірае моц класічны рыфмаваны радок, чаго не было раней.

Пошукамі ў галіне формы вылучаецца і зборнік «Забі ў сабе Сакрата!». Большая частка твораў мае невялікі памер (у асноўным двух- і чатырохрадкоўі), яны адпавядаюць эстэтыцы абсурду. Прысутнічаюць у зборніку і такія формы, як туюг, манаверш, а ў сааўтарскі Веры Бурлак – і трыялет-брахікалан. У вершах зборніка, такім чынам, знітаваных абсурдным зместам, назіраецца працяг эксперыментаў з формай, але ўжо іншага кшталту, чым у папярэдні перыяд творчасці.

Гэта апошні на сёняшні дзень зборнік паэта. Далей былі толькі вершы з так і не выдадзенай пакуль што кнігі «Стапеліі». У гэтых творах знікаюць не толькі знакі прыпынку, але і рыфма, пераважае верлібр. У некаторых жа творах наглядаецца вяртанне да класічных змястава-фармальных традыцый («На правай маёй далоні...»). Увогуле, фармальныя пошукі тут сыходзяць на другі план, саступаючы месца ідэйна-тэматычным.

***А. С. Мхаян*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна****,*
*к.ф.н., дацэнт*

## КАНЦЭПТ *ШЛЯХУ* Ў ТВОРЧАСЦІ А. РАЗАНАВА

Канцэпт – гэта складаны комплекс сэнсаў вобраза, які ўзнікае ў паэта пры спалучэнні ўласнага, нацыянальнага і сусветнага вопыту. Да гэтага дадаецца яшчэ вопыт чытача. Рэалізацыя канцэпту *Шляху* ў лірыцы А. Разанава адбываецца па наступных мадэлях: шлях па крузе, шлях у нікуды, шлях вяртання, шлях углыб, шлях у бясконцасць.

Атаясамліванне жыццёвага шляху з кругам належыць да класічных уяўленняў. А. Разанаў развівае гэтую ідэю, і ў выніку прыходзіць да глыбокай высновы, што галоўнае ў шляху па крузе – не спыняць рух, г.зн. само існаванне, якое і з'яўляецца мэтай